**Я. ЮХНАВЕЦ**

# Шорах моўкнасьці

ВЕРШЫ

www.kamunikat.org

ВЫДАНЬНЕ: УЛАДЗІМЕРА ПЕЛЯСЫ
НЬЮ-ЁРК 1955

www.kamunikat.org

## З ЦЫКЛЮ „УСЬЦЯЖ НОЧАЎ"

### УНОЧЫ Ў ГОРАХ

Грываў бель рашчэсавалі хмары,
на небасхіл памалу ймкнулі.
Каціўся месяц ім насустрач
і целы іх ірваў, як куляй.

Лятоюю птушкі рэха з долаў
лунала дзесь за перавалы,
і зоркі сходзілі з вышыняў
напіцца смагла ў плёсах з хвалі.

Так зырка вокны горнай хаткі
калолі цемру сьвятлінёю
і зіхацелі пад ваконьнем
бярозы срэбнай лісьцінною.

А вусьціш сьцёбала каменьне,
свае рагозячы рады,
і паляцеў на хмарах вецер
на супачынак у сады.

І гэта ён прыносіў грукат:
руйнуюць горы верхавіны —
правечнасьць нішчыць, каб сюды аж
зыйшлі нябёсныя даліны.

І ўжо, здавалася, былое
каля мяне навалай — міма,
і зь небасхілу ужо хмары
далоў плылі, плылі нястрымна.

1947.

* * *

Краскі пад узмахам ветру
былі полымем пажару.
Адбіваў навалу хмараў
агнявісты промень-джала.
Ды няўмольна хмараў валы,
каб затуліць прыход начы,
крокі цемры прыкрывалі,
хто іх мог перемагчы?
У цемры вецер доўга, доўга
таполяў гонкасьць выгінаў.
І срабрыстым клыкам месяц
апону цемры разарваў.

1947.

www.kamunikat.org

* * *

Закасаныя рукавы па локаць,
і сьвятло.
Вецер, зрокшыся далінаў,
залоціць пушчы.
Намяло
У садзе нашым каля плоту
збаравелых пелясткоў.

Плойму абарваных красак
я жадаю, — разьбяру.
Ды вецер, зрокшыся пушчараў,
згасіў намер,
дзесь угару
занёс яго.

— Сьмерць я сьмерцяй прыбяру, —
хваліўся потым у бары
вецер.

www.kamunikat.org

## МАЛЮНАК

Цэлы дзень мітусілі неба хмары,
ім цэлы дзень сьвяціла сонца.
А цяпер яны дайшлі да небасхілу
і яго чакаюць на спачын.
Пухам залатым яны набухлі,
мякка паляглі прад сонечным палацам,
і вячорны промень на кілімы
іх ступіў агністаю ступой.
І так пайшоў, пайшоў памалу
у глыбіню сваіх начных палацаў,
і толькі бронзавы адплыў паветра
у небе ціхай хваляй лёг.

www.kamunikat.org

* * *

Бы нейкі успамін цяжкі.
Ты ў хаце, ды хата ўсё-ж пустая.
Агні запаленыя ля ракі,
на хвалі полымя спадае

Я гэта бачу за вакном.

За далягглядам цішыня чарнее.
А коўш, напоўнены віном,
водбліскам хмяльным калее —

чароўнай прагнасьцяй суздром.

Я прыгаства ніяк не атулю...
І толькі вусны, каб вымавіць — люблю,
складаюцца, як да цалунку.

А хата ўсё-ж пустая.
Купальскі вечар. Уявай я лаўлю
твой вобраз, што нада мной вітае.

www.kamunikat.org

* * *

Маразянае звонкае раньне.
Асьверы скрыпяць, і бушуе зара.
За вакном мая любая, бачу,
порсткага поіць каня.
І да ганку да ейнага сьцежка
сьледам
раўнюткім лягла.
І лятуценьні — думак узьлёты.
І словы потым — каханьне маё.

Маразяныя звонкі раніцы.
Асьверы скрыпяць, і бушуе зара.
Прабягае мой позірок,
спыняецца
так часта ля яе двара.

## ІЗ ЖЫДОЎСКАГА

Па хвалях крывавых падзеяў
да сьвятых берагоў паплывуць караблі.
Жонкі зрадлівыя прыйдуць ізноў
у сад Салямонаў расьцьвіўшы.
І будуць слухмяны яны перад ім,
слухмянейшыя за нявольніц,
пакуль іх зьдзерванелыя душы
прытуляцца бронзавым целам.
І з жарсьцяй таемнай тады
іх цар павядзе па лугох і па нівах..
— Часам вятры ў гультайствах гульлівых
у свой заварочваюць круг,
ціха прашэпчуць уладныя вусны.
Але-ж думкі заўжды вокаміг:
— Няўжо ты ізноў, нестамлёная пешчамі,
насустрач забойцы пабяжыш, Суламіт?..

www.kamunikat.org

* * *

Часіны надыходзяць уселякіх прадчуваньняў.
Занята дыхаеш вяснавым паветрам —
кунега.
І, забыўшыся на ўсё сьмяротнае,
цягнешся, як кволае сьцябло, зь цемры
да нечага.

Яно ажно знаёмае,
яно так зялёнае
там, дзе сады запушчаныя,
там, дзе стаўкі зарослыя —
адзіноцтва.

І не жадаецца абы з кім сустрэчаў,
але сукрыта думаеш пра ласкі ўчарайшыя.
А потым неяк узбудрожана:
— Няўжо адгэтуль шчасьце
пэўнае
паўночнае?

І адлятае ўсё мінулае.
На хвалях лятуценьняў сябе шпурляеш.
І подых жданы забаўляе,
мучае
шыпшыну зацьвіцелую
сярод шыпуль сваіх
калючых.

* * *

Намер праклёнаў ёсьць адзін:
зраўнаць Душу у векавеччах,
вярнуць туды, дзе ход пачаўся
па мастох з крыхкога вецьця.
На абразох намаляваць
яе па іншаму, як трэба:
прыгнуты дуб у завіруху
із суччам, быццам зрэб'е.
А далей, каля кустоў,
лісьцё прыпалае прышчэпам...
Ды вось пытаньне — неадчэпны сьцень:
— Мо галубы у клетцы лепей?

І загадка стала перад загадкай.
Мы ізноў тут няпрычым.
Мы разумеем: лес — раздольле,
і зь дзікай таямніцай сьпім.

А ўсё віхравіць несканчона.
Ўсё у вобмацку сьляпым:
і конь з разгону перад прорвай,
і голас наш
нямы...

* * *

Лета, лета на зямлі ўсёй.
Вясна-прамежак, крывёю адцьвіцела.
Але-ж ізноў у садзе пустазельле
расьцярушыла сваё семя.

І прынадлівым сям'і пчалінай лоскам
на пустазельлі краскі вырастаюць,
і соты поўныя — жыцьця прыталіны —
наліваюцца артутным сокам.

А лета, лета на зямлі ўсёй.
Вясна-прамежак, крывёю адцьвіцела.
Але сьмяецца, млынар сьмяецца —
ня ўзойдзе болей пустазельле.

1948.



www.kamunikat.org

* * *

… і сьлёзы дзяцінныя — пачатак наш,
і калі зьбянтэжаныя з адказам і пытаньнем —
выступ грайкі зводзіць нас
з нашым цёмным гэткім раньнем.

У смутку цяглым дзяцінных зваб
на спатканьне цягнецца Яе рука,
і насустрач той самы раб,
у тых самых берагох рака.

А потым быццам — усё здарыцца…
Ізноў красуюцца краскі дзіў.
Але знаёмае незнаёмым робіцца
там, сярод
ужо дасьпелых ніў.

www.kamunikat.org

## З ЦЫКЛЮ: «ШОРАХ МОЎКНАСЬЦІ»

### ДАРОГА

Цаліну схавалі ў віткох ральлі,
там нешта некалі пасеюць.
Але дарогу ужо там правялі,
бадай падшылі да апраньня лею.

Быццам высахлы ручай сьпякотай,
яна нідзее у сьлядох калюгаў.
Зырваны прокмецяй узьлёту
на ёй сябры і пыл і постаць.

Дарога ведае іх скрыжалі
сярод ральлі
яе
і збудавалі.

1951

www.kamunikat.org

КАСЕЦ

Вадрыла скошаная асака.
Цяжкая праца
                    зь любасьцяй
касцом працягвалася.
Рака
ня выпускала ні кроплі зь берагоў,
між імі сьцісьненая сьпякотай.

Як квола рэдкае дзявочае рукі,
(за якую навет ты ёй увесь аддадзены),
пралятаў ад ніваў сухавей
блаславёнай ласкай, непамінанай.

І здавалася усё далей
ад касца адходзілася
пад пушчу асака.
Шырэй расходзіліся за ім пракосы,
быццам водраныя сенажаці косьці.

Шчэ надвячоркам ён дакасіў да пушчы.
О, задавольнасьць ты нястомная!
Пот абцёр. І вось тады спакмеціў:
трава між дрэў, бы ў зялёным лёце,
бы мудрасьць найвялікая у сьціплым пераплёце.

Ідзі, касец, дамоў,
ідзі.

1952

## СЬЦЮДЗЯНІЦЬ...

Сьцюдзяніць за горамі спакой і змрок,
а словы круцяцца адсьветам дня —
у ціхай мернасьці яшчэ ня змоўк
стук сэрца і глыбіня,
што сьніцца ў начох вясьняных.

Цісьнецца яна і ласкаю і кругам,
і сьлепіць чарам разбуджаную жарсьць,
і сэрца робіцца вяршалінай натугаў
ськінуць камень: каб высіцца й стаяць.

Але за горамі сьцюдзяніцца змрок,
І каменям нямее водбліск дня:
у шпаркасьці абвалу ён замоўк —
шуміць у долах падмывамі вясна.

1951

www.kamunikat.org

* * *

Вобразы з утулаў акіяну — мушлі
(над імі дзень сьвяціўся
і вечар
ужо пакінуў іх)
хрусьнелі
пад ступнямі нашымі,
у гэты быццам вокаміг
хвалі плёскаты
мацнелі
скрушна.

Ня позна ім ламаць уздоні!
Бы даланямі на узлонь далін
бераг уздымаць і пеніцца узроняй:
нятратай пырскаў з ухопінай жарсьцвін.

У перамозе ня помніць боль зямля!
— У парожніх мушлях мінулае жыцьцё —
дай слухаць ім яго ад хваляў, —
сказала, любая, ты мне.

І я
часіну нараканьня чаліў:
я-ж — натоўп, што любіць аж на дне
пышнець пакорнікам
і не забывацца прысна
існасьць
няўторную:
— Сьмерць заўжды ратунак і жыцьцё!

## НЯ СЬНІЛАСЯ

Вясьняная ня сьнілася чароўнасьць.
Сьвядомасьць азірнуцца аж назад
мяне ня звабіла перахрысьціцца
на які-небудзь папад.

... дзе-б не канчаліся дарогі
сумленьняў сьветлых, як сьвятло,
мэдузы цела спатыкаецца,
у хвалі кіненае, каб плыло.

Навет і тады чароўнасьць сьніцца,
і абяцаць бадай што згодны:
— Я пакажу: вунь дом ваш нізіцца,
мне-ж камень кінены — прытул мой родны.
1952

www.kamunikat.org

* * *

Пачатак быў пачаткам сам,
зьверадаваны пешчамі й друзгамі пары ўсякай.
З імём людзкім, скарынкаю абмяклай
на плечы нашы лёг, і ў сьцінкі рам,
што з нашае крыві штодзённай закарэлі.

І болей не здаюцца ўяве думак нашых
ракою змытыя на сплыве мелі,
і вечна нашчыя зьвяры на пашы,
навокмець нязгублёныя ў прасёлах лесу.

Мы таксама зыйдземся у сваім пачатку
цішэй ночы зімовай; із сумленьнем
праз ручай паложым заўтра самі кладку,
што мы ў хаце не асядзем сьценем,
і думкай не асілімся: як з нашым пакаленьнем?

1953

АДАМАВЫ ПЕСЬНІ

Песьняй не распальвацца і не хваліць
найпершыя запевы дзён вясьняных.
І не барзьдзіць мне да мясьцін пазваных:
аксаміты раюляглі там ніц.

Уторы навальніцаў апаўдні заціхлі.
Ціхатой расьцьвіту не марудзіць сад.
Заходзіць сонца. У надвячорны злад
ня выпусьціў ён сё-ткі вадрыстыя завіхі.

Для маіх таемнасьцяў поўная дагодаў
яна ня ждалася як некалі і як учора.
У радасьцях старых пад схонам прыгаства Заходу
хаджу вядомым на бераг мора,
казаць начы: — Любі салодзь Усходу
з дагодай зваб, — і будзе рай — Дакора!

1953

ЧАЛАВЕК-СТАТУЭТКА У МУЗЭІ

Перасьцягнены выпадкам, праз бязуважнасьць
ты застыг, мо вечна, у зьлепку з гліны.
У вобразе найлепшым людзкое дамавіны
ня ціхне разам чарвяка ўсьцяжнасьць.

А нам, жывым яшчэ ўмеру,
засталося, мабыць, пашкадаваць цябе:
што вусны закаханай — несупакой намеру,
не адплылі цалункам па ілбе.

Ды ты прыціх пад змрокам сьценаў
і кажны шорах наш жывы хапаеш,
каб ноччы разбудзіцца: на колькі жменяў
узьняцца аж пад столь... І напаткаеш
донь найбольшую празорых шыбаў,
зор прасочыны, і кволасьць хмарных глыбаў.

1953

## ХРЫШЧЭНЦЫ

Хадзем. Акрыяў я. Якраз у час
старасьць надыйшла як і маё маленства.
Будзе люба ўсё. Жаданьне кажнае уразіць нас,
аддаючы крыві моц блізкага наўцемства:

хрышчэнцамі хадзем да сьлепасьці вякоў —
там гімны моўкнасьці, як скорсьць, што любіць
вартасьць —
сьвет палоханы чым небудзь зноў
у просьбы кідаецца, тайкуючы ўпартасьць.

І толькі даўшы ўбожну, тады
паверым собскай моцы пераможца.
Усяк унімемся трывогамі сваімі —
даляву якую кроў не апалошча...
Жыцьцё ясьніць нат кроплямі малымі.
Пытаешся: — Ці жыць хоць шчасьцямі благімі?
1954

САКРАТАВА

Ціхінь мінулая — размёты крылаў асьцярожныя
тайніцай атулі разгаданай ня імі.
Існасьці вускрос карэньнямі даўгімі
забяры граніт і часьлінкі душы парожнай.

Шчэ пакідаецца шмат месца для жахлівага.
І можна паважаць было — знаходзіць свою рату.
Нясуць атруту — даўгі за некага. Караюць за віну: напэўна, кату
што ўчора сноўдаўся, нікім ня гнаны,
прысьніўся дзень і грош не зараблены.

1952

www.kamunikat.org

## ПАМЯТАЕЦЦА

I.

Памятаецца круты усьцін дарогі,
бы сьцісьнены вясьняным плёнам дрэў,
І ціхаці душы, ў моўкнасьці чутлівыя,
і скраткі ручая, што сонцам дня гарэў.

І незабыўная сустрэча спадзявання:
я — вечны вой… Свабода, ты мая.
І скрык зьвярыны — не апошні —
часіны будычыні ўтроплю я!

www.kamunikat.org

II.
Гэтак у дзень небывалы,
там, дзе абтокі цьвілі,
ніклі шэпты хвалі
да водшабаў цеснай зямлі.

І час у раджэньню няведамкім,
у сьветлым імжэньні душы,
болясьцяй гострай справеднай
веціў узьмежжа, скажы:

дзе станьвай замкнёнай, спрычонай
цярплівасьці згубленых мрой
пакінуцца вокмецяй новай,
я вечны атпусьнік — жыцьця няўтой.

www.kamunikat.org

III.
…што-ж, калі гэта зусім разьвіталася,
мабыць, іншыя ведала сьцежкі яно,
бо вельмі ахвотна згаджалася,
бы зярно у зямлі прырасьці,
разыйсьціся у продані памяці
заваладанай пошукам гульняў падбойных,
каб цеміць: віхруся у шчасьці сваім
навет пад сподам сырым і глухім.

www.kamunikat.org

IV.

… і дуэт: шалёная ахвота шуму,
і прамінкі ночаў, і каханьня,
і полымя схаванае у сэрцы-глуму
мне ўсё прыносіць раньне.

Я ўсё адным узьлётам
крануць жадаю гараў крылы,
і садам узрасьціць гаёў абтокі,
каб сэрцаў полымя засьцілі.

Там вусьціш дзіўная-б жыла.
Там спамін наш лепшы пачынаўся.
Бы жытнёвае далявы узмах
сад на вецер апіраўся.

www.kamunikat.org

МЕНСКАЯ КАЛЬВАРЫЯ

Помнікі ў моўкнасьці, што нас хвалюе,
бы адзіным выхапам сьцяжын кароткіх,
узьняліся угару. Іх пэўныя сьляды —
магілы
адтокамі старых узрэччаў адыйшліся.
Між імі ў разбудлівым, з муравы, засьцілі
весяла павеі ветру блукаюць.

Бы нядобры рыцар, там сьвятыня
дзіду гострую — званіцу у неба выцягнула.
Там паставілі яе жывыя. Усьлед за ёй —
не надвак,
у каменных плітках бяжыць алея,
Сьцьвярдзела...

Усё трываюць сонцам дні. Мальбой пакуль
сьціхаюць
каля крыжоў карэньні неба — сьцені,
ня прыходзіць мніх у змрок тае сьвятыні...
Таполі
шэптам прыхалоды сподў
з Богам росьцяць шум сваіх вяршалін:
з іхнай боляй за равом, у полі,
адросьлі іхныя апынуліся.

1953

## НА ЗАМЧЫШЧЫ

На замчышчы толькі вусьціш.
У вышынях месяц спынёны.
Вецер, чаму ты ня хлусіш
песьню разрытай калёны?

Як добра! Хоць раз заўнімуся
і псальму сьпяю усяночную.
Рэхам з вуснаў маіх разліюся,
бы на скале вада ўсточная.

На замчышчы вусьціш прапала.
Месяц,
                здаецца, ты сьпевам спынёны?..
Ах, вецер узноў, — нябачная хваля,
і шорах пясочны з калёны —
мой сьпеў зглумлёны.

1953

www.kamunikat.org

* * *

Мрояў парываньні у вечным камяненьні,
у прокмецях аддайлівай кляцьбы,
калі вітаеш духам сутарэньне
падчас разгневанай мальбы.

І гэта цяжкае і шляхатворнае,
як дом, пакінены стрымніне бацькоў, —
няхай гадуюць гады старыя,
чорныя,
ты-ж мрояў камень, ня песьня вечароў.
1952

www.kamunikat.org

* * *

Бывае часам,
нашыя галовы
унадзяць дзіўныя і думкі й лятуценьні...
            Накладаваны цяжка воз
за прыдарожны зачапіўся пень.

І не адчэпіцца. Стаіць.
Гаспадар лянуецца, напэўна, зьлезьці?..
            Сьвет у цемраве із возу
яму здаецца — маленькі й цесны.

www.kamunikat.org

## БАЛЯДА АБ НЯ НОВЫМ ГЭРОЮ

Пахінены на маладзенства меча —
меч яшчэ крывёю ня зырчэў —
гэрой чакаў, бо веча
душа была яго, ня гнеў.

— Ёсьць радасьці і смуткі на зямлі,
ёсьць цяплыня і сьцюжы жарсьці, —
нашэптвала Яна. — Цяплі.
— Няўжо іх трэба сталяй красьці?

— І пад бярозай зь веснавым сядзёрам,
што на моўкнасьць
                    карэньня
                              скропвае,
лятуцець пра ворага? Пад дзёрнам
навальніцаў толькі чуцен рокат...

    Адзінока вахаліся на небакраі хмары.
Даляву аздобілі ухопіны жыцьця,
а ён, дзіця
з душой нягнеўнай,
ня зманена
усё чакаў змаганьня,
і шэпт яе: — Твая.

## ОДА РЫДЛЁЎЦЫ

О, мая зялезная сяброўка,
табе танклявая, прыгожанькая Муза
йшчэ не сьпявала віншавальных одаў:
баіцца, каб чароўненькія вочкі
ты не засыпала пяском,
каб пантопляў, з шоўку шытых,
ты не забрудзіла зямлёй.

Затое я табе пяю:
о, ты сваёй зялезнай жменяй
засып памерлых між жывых,
каб жыць магло усё жывое.

www.kamunikat.org

* * *

Зыйшоўшы крокаў некалькі з узгорку
апынішся на скрайку даўніны тваёй:
там струмяніць усё аблітая крывёй
Няміга вузкая, нібы у надвячорку

сутоніць водгуль далёкае паходні.
Там прывідам вітальных стогнаў захаплёны
мройны мір ня цісьнець грудзі плёнам:
спагаднае прымі жыцьцё, як ёсьць, на сходні

пакуты вашае, цярпеньняў і пагардаў…
Плыві, Няміга! У збытку поеныя патокам скрух
скарынку хлеба богам не прыклікваюць.
Свабоды зайздрасьці ня цешацца прычасьцяй
скаргаў,
як чуткі досьвіткам — так кволяць хвалі слых, —
грахамі усялякімі… і добрымі мы баім іх.

www.kamunikat.org

# СЛОВЫ ПРАЎДЫ СКОШАНЫ

Словы праўды скошаны.
усялякім словам,
і гады.
Манашка ўздыхае верак —
шум вады.
Нябачны вецер вырастае хваляй, —
уважай!
Крычыць дзіцё маленькае:
— Ня трымай!..
Я твае цалую вусны
аж за край —
гэта слова бясслоўнае:
— Бывай!

1950

www.kamunikat.org

* * *

Сходзіцца празора адцвітаньня —
радасьць з смуткам у вадзінай сіле.
І дзіўнае пытаньне: — Ты хочыш быць дзіцём? —
Цеміцца, як зачараваньне...

А краскі тыя, што яшчэ красуюць
пад самым каменям
у маленькім сьцені —
бясконцы вокаміг дзявочых сноў,
калі дрыготкі іхных плеч,
бадай, як скарб
у ягонай жмені.

— Хадзем, хадзем! Мяне вазьмі
рукой з галінкамі сініх венаў...
Там да краю возера спаўзьлі
лугоў накрывы,
о, нязьменныя!

1951

www.kamunikat.org

* * *

Ты ад крыніцы йшла тады
калі ён выехаў з-пад шатаў елак.
І прыслухоўваючыся да сьпеву пастуха,
незнарок цябе пабачыў.
— Мая ты, любая, — усклікнуў ён.

Ты-ж ціхатою золаку спынілася
але вядро з вадою расу не абабіла.

— Да рэхі слоў тваіх
прыслухалася, — сказала ты яму.
І звабаю каханьня —
плячыма ўскалынула зналуску.
На хвалькі у вядры зірнулі вы абое:
няцёплая ірдзелася на іх зара.

www.kamunikat.org

* * *

Ты ціхаю мяне спаткаў тады.
Бы нашы рукі столкамі зрабіліся.
Ты навет не сказаў: — Кахаю я цябе —
словы лепшыя для кажнае спакусы.

Толькі там, дзе вуліцаў шырынь
канчалася у зірку прасьцягоў далёкіх,
і сады вясной апошняй ня цьвілі,
ты глянуў на мяне у збытку шчасьця.
— Ня кінь, чароўная. —
прагаманіў у сузьмені нашай блізкай.
І прокмець тую — харасство адвечнае,
я тайніцай грэшнай
свае душы кранула...

ЭСКІЗЫ

І.
Слову свайму я дасяжыць магу.
Пыл па дзьмуве асядзе…
Саромка дзяўчына нагу
зь берагу у хвалі апусьціць.

Спаткаўшы ізноў яе,
шчасьце — камень, лепш ты не кажы.
Яе вусны, як лук у воя,
яе словы — расьцяг мяжы.

А так зразумела між гор
мінулая памяць вякоў,
і ветру вясьнянага хор
дрэвы доруць для зор.

ІІ.
…прыходзіла жонка ў сьпякотныя дні
да яго з вадою крынічнай,
на ўзьмежку садзілася, і пчолы тады
спалоханыя з красак ніклі.

Спляталіся рукі яе і ягоныя.
Каханьне іхнае — гамонка душы.
Пастух забыўся пра статак свой
У прахалодзе каханьня мрой.

www.kamunikat.org

III.

Сонца чырванела ў зьмямозе дзённай.
— Я ведаю, сярод начы,
ён спытае: — Хто ты, жонка?
Я адкажу: карэнь з раямі,
асачы!

А вецер гнаў прапушчанае ўчора.
Човен затануў — выпадак на рацэ.
Імём каханым я крамяніла грудзі —
запальная іскра на цэр!

Плыты зьвязалі віткамі лазовымі.
Сьпявалі плытагоны над прорвою віроў.
Чужыя жонкі купаліся на воддалі:
— Дзе-ж хвалі пешчаў?..

Сьпяшаліся дамоў.

Смачная вячэра дымілася у місках.
Радасьць сьцерагла начная ціш.
Там зоры не адходзілі ад месяца,
там іхная зьнемагала выш.

А нехта просіцца да хаты.
Чаму пад зорамі не начаваць?
Пешаходам коньнік перагнаты,
яго ня цешыць мая суладзь.

І вось рукі твае я губляю.
Жарсьці аддацца — размова спатканьня.
Розум узвысіць — вязанак дачасны,
забыцца жадаю — шмат потым раніц.

IV.
Сунімаецца млява сьпякотнае лета.
Побач песьня - кліч сьмерці:
— Ідзі! Ня прыходзь!
І абяцаны аванс не зьвярнецца,
і крык гандляра: — Ня зводзь!

І шорах моўкнасьці — вадаліў
жыцьця пакіненага сярод пустэчы:
Прамежак дзьверы за мною зачыніў
і толькі памяцяй глядзяцца рэчы.

...азіраецца памяць — шасьцяньнем мерыць
свой спад із дрэва ліст.

1950

## ЯМУ ЖАДАЛАСЯ

Яму жадалася сказаць усё.
Ягоны дзень яшчэ — бы зьніч.
Вясёлка скоціцца, як калясо,
уніз.

Там — адхоністай высі ўздойм
і хмары — спрэчка із гонкасьцяй муроў,
і вецер — сьпеў: ліні далоў,
дождж.

І сьціхнуць.
Зьбіраюцца на выган дзеці.
У карагодзе шчодра мігацяцца пяткі.
Дзядок сівы іх радасьцяй абняты,
жадае небу сказаць усё:
— Мой дзень яшчэ — бы зьніч...

А думкі сьцераглівыя, дзе спакой капліц:
вясёлка скоціцца, як калясо,
уніз.

1950

www.kamunikat.org

* * *

Клікаюць штодня званы маліцца.
Да прошчы ходзіць багамольны.
У сьценях уздарожных ліпаў
адпачыць спыняецца
і думае, думае шмат пра Бога,
або навет пра нікога.
Спатканага выпадкам падарожнага
як радзімага, прывітае ветла,
а растанецца, уздыхне, варожыць:
да мясьцін сьвятых шчэ цягнецца дарога.
І думае, думае ізноў пра Бога,
пра палахлівасьць жыцьця на сьвеце,
пра зломленыя у калёсах спіцы;
і прад воблікам сьвятых укорнікаў,
успомніць: малітваслоў забыўся,
пакінуў дома
на паліцы

1952

## У ВОСЕНЬ ЗАЛАТУЮ

*У. Пелясу*

Вецер у садох, бы шорах басаногіх.
У шчызе подзьмуху ня схутаны прыцем часін.
Чагосьці не хапае. Як цяжкі ўспамін,
буяя лець мясьцін валогіх.

І хінецца ў большую глухату сваю
бор у воддалі. Й надзіць брунь крыніц
неманяй карэньня віцца, і ня ясьніць
аздобу кволую травы па ўскраёх.

Так каб мог сказаць: — Пяю, —
зналуску мінаючы ўсьцяжы вецер,
тады мо зноў нас голас асьцярог
рыньвай восені залатой наўвецены:
— Жыцьця карцівасьці само жыцьцё зьбірае.

1953

* * *

У барох несуцішная водгуль.
Вазёры — прыпынак усьцяжаў.
Згубленай воддаляй
неба
вечнасьць таёмную кажыць.

У плёсах дрымлівых ракі
песьня разьбежных лугоў.
Звахам маленца рукі
летні подзьмух вятроў.

Сьціж неадгоннага чару —
вокмеці нашага прыйсьця.
Радасьці возьмеш надару —
скалынёныя восянай лісьця.

* * *

*Я. Шакуну*

Сьвітае. Лятнея небакрай. Мінае шчызь начная.
Шорах кажны робіцца знаёмым і далёкім:
успомніцца усё тады — прыхапкам ён лёгкім
душы назоў дае, — сумленьняў сьцень кранае.

Далячыня спакволіцца — пад небам, як на дне;
Зара агнівіць, бы сонечны ахон скразны;
цяжкасьцяй акоймленай упросіць моўкнасьцць сны —
воблікам жыцьця ня споўніцца, хіба-ж, мне?..

www.kamunikat.org

ЗЬМЕСТ Бачына


| | |
|---|---|
| Уночы ў горах | 3 |
| Краскі пад узмахам ветру | 4 |
| Закасаныя рукавы па локаць | 5 |
| Малюнак | 6 |
| Бы нейкі успамін | 7 |
| Маразянае раньне | 8 |
| Із жыдоўскага | 9 |
| Часіны надыходзяць | 10 |
| Намер праклёнаў | 11 |
| Лета, лета | 12 |
| І сьлёзы дзяцінныя | 13 |
| Дарога | 14 |
| Касец | 15 |
| Сьцюдзяніць | 16 |
| Вобразы з утулаў акіяна | 17 |
| Ня сьнілася | 18 |
| Пачатак быў | 19 |
| Адамавы песьні | 20 |
| Чалавек-статуэтка | 21 |
| Хрышчэнцы | 22 |
| Сакратава | 23 |
| Памятаецца | 24 |
| Гэтак у дзень небывалы | 25 |
| Што-ж | 26 |
| І дуэт: шалёная ахвота шуму | 27 |
| Менская кальварыя | 28 |
| На замчышчы | 29 |
| Мрояў парываньні | 30 |
| Бывае часам | 31 |
| Баляда | 32 |
| Ода рыдлёўцы | 33 |
| Крокаў некалькі з узгорку | 34 |
| Словы праўды | 35 |

Сходзіцца празора 36
Ты ад крыніцы 37
Ты ціхаю мяне спаткаў 38
Эскізы 39
Сонца чырванела 40
А нехта просіцца 41
Яму жадалася 42
Клікаюць штодня званы 43
У восень залатую 44
У барох несуцішная водгуль 45
Сьвітае 46

© OCR: Камунікат.org, 2010 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2010 год
© PDF: Камунікат.org, 2010 год